CENTRALNA KOMISJA EGZAMINACYJNA

Arkusz zawiera informacje prawnie chronione do momentu rozpoczęcia egzaminu.

**WYPEŁNIA ZDAJĄCY**

KOD

PESEL

*Miejsce na naklejkę.*
*Sprawdź, czy kod na naklejce to* **M-100**.
*Jeżeli tak – przyklej naklejkę.*
*Jeżeli nie – zgłoś to nauczycielowi.*

# Egzamin maturalny *Formuła 2023*

# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom rozszerzony

**TEST DIAGNOSTYCZNY**

*Symbol arkusza*
MMBB-R0-**100**-2412

DATA: **9 grudnia 2024 r.**

GODZINA ROZPOCZĘCIA: **14:00**

CZAS TRWANIA: **210 minut**

LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **35**

**WYPEŁNIA ZESPÓŁ NADZORUJĄCY**

Uprawnienia zdającego do:

☐ dostosowania zasad oceniania.

**Przed rozpoczęciem pracy z arkuszem egzaminacyjnym**

1. Sprawdź, czy nauczyciel przekazał Ci **właściwy arkusz egzaminacyjny**, tj. arkusz we **właściwej formule,** z **właściwego przedmiotu** na **właściwym poziomie**.
2. Jeżeli przekazano Ci **niewłaściwy** arkusz – natychmiast zgłoś to nauczycielowi. Nie rozrywaj banderol.
3. Jeżeli przekazano Ci **właściwy** arkusz – rozerwij banderole po otrzymaniu takiego polecenia od nauczyciela. Zapoznaj się z instrukcją na stronie 2.

Układ graficzny
© CKE 2022

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy ten arkusz egzaminacyjny zawiera 14 stron.
   Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Na pierwszej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
3. W wyznaczonym miejscu zapisz numer tematu wybranego do realizacji.
4. Wypracowanie zapisz w miejscu na to przeznaczonym.
5. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
6. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
7. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
8. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.
9. Możesz korzystać ze słownika języka białoruskiego.

**Lista lektur obowiązkowych w roku szkolnym 2024/2025**

**Poziom podstawowy**
Францыск Скарына, *Прадмова да ўсёй Біблії*;
Канстанцін Вераніцын, *Тарас на Парнасе*;
Кастусь Каліноўскі, *Пісьмы з-пад шыбеніцы; Мужыцкая праўда № 1*;
Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, *Пінская шляхта*;
Францішак Багушэвіч, *Прадмова да Дудкі беларускай; Калыханка, выбраныя вершы*;
Змітрок Бядуля, *На каляды к сыну; Пяць лыжак заціркі*;
Цётка, *Шануйце роднае слова*;
Максім Багдановіч, *Апокрыф; Хто мы такія; Санет*, выбраныя вершы;
Максім Гарэцкі, *Рускі; Стары прафесар*;
Янка Купала, *Курган; Незалежнасць, Явар і каліна, Спадчына*, выбраныя вершы;
Якуб Колас, *Новая зямля, Што яны страцілі*;
Кузьма Чорны, *Макаркавых Волька*;
Наталля Арсеннева, *Малітва*, выбраныя вершы;
Ларыса Геніюш, *Маці мая сялянская*, выбраныя вершы;
Янка Брыль, *Галя, Маці*;
Ян Скрыган, *Слепата*;
Іван Шамякін, *Дзеці настаўніцы*;
Іван Мележ, *Людзі на балоце* (фрагмент *Сватаўство*);
Барыс Сачанка, *Чаравікі-туфелькі, Дарога праз лес*;
Уладзімір Караткевіч, *Зямля пад белымі крыламі* (фрагмент раздзела *Зялёны шум*, фрагмент *Людзі зямлі беларускай*), *Дзікае паляванне караля Стаха* (фрагмент *Расказ легенды пра караля Стаха*); *На Беларусі Бог жыве*, выбраныя вершы;
Ніл Гілевіч, *Каб людзьмі між людзей пачувацца*;
Сакрат Яновіч, *Гасцінец, Прыгожай, Бацькаў гнеў, Вёха – багіня ганьбы*;
Яўгенія Янішчыц, *Ты пакліч мяне. Пазаві*..., выбраныя вершы;
Аляксей Дудараў, *Вечар* (фрагменты з дзеі першай);
Васіль Быкаў, *Аблава*, *Калі хочацца жыць*;
Алесь Барскі, *Беластоцкі край; Я сын зямлі беластоцкай..., Селянін, як тварэц...*, выбраныя вершы;
Святлана Алексіевіч, *Чарнобыльская малітва* (фрагмент *Самотны чалавечы голас*);
Барыс Пятровіч, *Спачатку была цемра* (фрагмент 1 раздзела часткі другой).

**Poziom rozszerzony**
Максім Багдановіч*, За сто лет;*
Максім Гарэцкі*, Фантазія;*
Якуб Колас*, У палескай глушы (*фрагмент *XVI часткі);*
Янка Купала*, Тутэйшыя;*
Рыгор Барадулін*, Жыццё і паэзія;*
Сакрат Яновіч*, Пад знакам Арла й Пагоні (*фрагмент *30. Эліты);*
Ларыса Геніюш*, Споведзь;*
Надзея Артымовіч*, Ёсць тое...,* выбраныя вершы;
Алесь Разанаў*, Sumus ne simus,* выбраныя вершы;
Вольга Рымша*, Рэквіем;*
Уладзімір Арлоў*, Незалежнасць – гэта...;*
Барыс Пятровіч*, Трызненні (*фрагмент *Шчасце быць – 1).*

**Выберы адну з прыведзеных ніжэй тэм і напішы сачыненне.**

- Твая праца павінна складацца не менш чым з **350 слоў**.
- Нумар выбранай тэмы ўпішы ў рамку.
- Запішы сачыненне ў адпаведным месцы. Не пішы на палях.
- Сачыненне напішы па-беларуску.

Тэма 1. (0–35)
**Паэтычныя вобразы вёскі. Паразважай над тэмай на падставе параўнаўчай інтэрпрэтацыі вершаў Яўгеніі Янішчыц і Уладзіміра Караткевіча.**

Яўгенія Янішчыц
***Прыедзь у край мой ціхі…***

Прыедзь у край мой ціхі,
Тут продкаў галасы,
Тут белыя буслiхі
І мудрыя лясы.

Хапае на Палессі
І сонца, і вады.
І што ні двор – то песня,
Што вёска – то сады.

Па травах светла-шызых
Мы пройдзем ля ракі,
Дзе, мыючы бялізну,
Вядуць сваё жанкі.

І будзе песня спета
Пра шчасце і бяду,
І будзе падаць лета
Ў гуллівую ваду.

Прыедзь у край мой ціхі,
Тут продкаў галасы.
Тут белыя буслiхі
І мудрыя лясы.

https://knihi.com

Уладзімір Караткевіч
***О мой цудоўны край…***

О мой цудоўны край,
Мой заснежаны рай...
Ціхі званочкаў смех,
Снег у лесе начным,
Смех у садзе пустым,
Коней спакойны бег.
Штосьці часцей і часцей

Сню я, што шэрань цвіце,
Падае з чорных сукоў,
Што з табою ўдваіх
Еду між дрэваў начных
Госцем да сваякоў.
Плечы твае абняў.
Роўная рысь каня.
Лес радзейшым стае.
Шэрань заткала бары,
Скроні мае серабрыць,
Беліць вейкі твае.
Бачу сялібу ў садах,
Бачу загурблены дах,
Нізкі, натоплены дом.
Хутка між яблынь густых
Будзеш смяяцца і ты.
Бачыш? Страчаюць з агнём.
Вязкі цыбулі вісяць.
Скварыцца каўбаса,
Водар смалы, сасны.
Дроваў адталы дух.
Печка.
Калматы кажух.
Сны.

https://knihi.com

Тэма 2. (0–35)
**Беларуская літаратура пра ўніверсальныя каштоўнасці. Паразважай над тэмай, абапіраючыся на прыведзеныя фрагменты артыкула Івана Навуменкі і два выбраныя творы беларускай літаратуры.**

Іван Навуменка
***Энцыклапедыя сялянскага жыцця***

Паэма *Новая зямля* – адзін з выдатнейшых твораў беларускай літаратуры – пісалася на працягу дванаццаці гадоў. Яна была задумана ў Мінскім астрозе як вершаваная аповесць аб жыцці і клопатах лесніковай сям'і, некаторыя раздзелы былі тады ж напісаны [...].

*Турэмныя* раздзелы сведчаць, што пісьменнік задумаў шырокі твор аб жыцці простага чалавека, звычайнага лесніка, маючы на мэце ўзвялічыць, апаэтызаваць свайго героя, паказаць яго ва ўсіх умовах, праявах жыццядзейнасці, у тыповых абставінах яго бытавання. [...] Пісьменнік браўся за жыццёвы матэрыял, які ведаў дасканала, глыбока, які адстаяўся ў яго свядомасці дзякуючы дыстанцыі ў часе (падзеі, апісаныя ў пачатковых раздзелах, адносяцца да 90-х гадоў мінулага стагоддзя), з уражанняў мастака адсеялася ўсё другараднае, неістотнае. [...]

Ёсць усе падставы гаварыць, што паэма *Новая зямля* – заканамерны крок у творчасці Коласа. [...] У паэме той жа герой, з якім мы знаёмы па лірыцы і прозе, –

селянін-бядняк. Толькі тут яго фігура намалявана ва ўсёй псіхалагічнай паўнаце. Пісьменнік паказаў у *Новай зямлі* беларускага селяніна ў поўны рост, намаляваў усё яго жыццё з буднямі і святамі, радасцямі і нягодамі, паказаў сілу і слабасць свайго героя. [...]

Спакваля, пaступова разгортваецца дзеянне ў *Новай зямлі*. Цячэ яно рачулкай паўсядзённасці, працы, бытавых клопатаў, займаючы не надта вялікія абсягі ў прасторы і часе, засяроджваючы ўвагу чытача на звычайнасці, тыповасці абставін сялянскага жыцця. [...] *Новая зямля* – кніга сялянскага, народнага жыцця. Інтанацыйна-настраёвы ключ паэт знайшоў з першых радкоў […].

Міхал і Антось – героі *Новай зямлі* – вобразы, якіх да Коласа яшчэ не ведала беларуская літаратура. Селянін, намаляваны беларускім паэтам, паўстае ва ўсёй сваёй духоўнай велічы і прыгажосці, ён не раб, не „забіты канчаткова”, паводле выказвання Дабралюбава, а чалавек, у душы якога жывуць усе „прыгоствы свету” (Купала), усе найвялікшыя маральныя дабрачыннасці.

Міхал, „як толькі ажаніўся, тады ж ад бацькі аддзяліўся”, бо не было з чаго жыць, не было зямлі, „стала цесна”. [...] Герой Коласавай паэмы – чалавек, насільна вырваны з тыповага для яго сялянскага асяроддзя, выгнаннік. У пошуках кавалка хлеба ён „разоў са два хадзіў у прусы”, г. зн. ганяў плыты па Нёмане, і зрэшты „пайшоў на службу таўкануцца, бо дома недзе развярнуцца”, гаворыцца пра Міхала. […]

У Міхале абудзіўся чалавечы гонар, пачуццё ўласнай годнасці. Ён ужо не можа, не мае сілы служыць за кавалак хлеба, зносячы штодзённую абразу, лаянку, кпіны. Ён не раб, а свабодны чалавек, і гэта самае галоўнае для разумення намаляванага Коласам характару. Зрэшты, калі ўдумацца, пасада лесніка давала дастаткова матэрыяльных сродкаў, каб Міхал мог пракарміць вялікую сям’ю, не ведаючы асаблівай беднасці. Але ў тым і справа, што гаворка ў паэме ідзе не толькі аб хлебе надзённым, але і аб катэгорыях духоўных, такіх, у прыватнасці, як пачуццё свабоды, незалежнасці, якой усім сэрцам прагне герой. […]

Чалавек, у якога ўзнікаюць такія думкі, нараджаюцца такія пачуцці, – ужо не раб. Гатоўнасць да пратэсту, нязгода са сваім сацыяльным становішчам – пастаянны настрой Міхала. […]

Многа разоў, літаральна ў дзясятках варыяцый, паэт падкрэслівае думку, што пачуццё асобы, уласнай годнасці ў простым чалавеку абудзілася, што, нават атрымліваючы за сваю працу „скарынку хлеба” з панскіх рук, чалавек гэты болей не можа, не мае сіл цярпець ранейшы здзек і абразу [...].

З якой з’едлівай іроніяй напісана сцэна ў раздзеле *Сесія,* дзе аб’ездчык, празваны „Памдзеем”, паводзіць сябе перад ляснічым прыніжана, па-рабску, забыўшыся пра свой чалавечы гонар. І як бліскуча ў той жа сцэне намаляваны „Рачок”, ляснічы, што адчувае сябе „звышчалавекам” […].

Міхал прагна, з тытанічнай настойлівасцю, цярпеннем шукае вызвалення з-пад панскай улады. […] Трагедыя Міхала – трагедыя ўсяго беларускага сялянства.

https:// knihi.com

**WYPRACOWANIE**

**na temat nr**

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

| Miejsce dla egzaminatora |
| --- |

| Miejsce dla egzaminatora |
| --- |

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
| --- | --- | --- |

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

**Tabele wypełnia egzaminator!**

| | | | | *Jeżeli **0 pkt** – wskaż powód.* | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **1.** | **Spełnienie formalnych warunków polecenia** | **0** | **1** | *Brak lektury obowiązkowej.* | *Nie dotyczy problemu.* | *Nie jest wypowiedzią argumentacyjną.* |

| | | | | | | | | | | | *Liczba błędów rzeczowych* | ***OGÓŁEM KLiK*** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **2.** | **Kompetencje literackie i kulturowe** | 0 | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | | |
| | | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | | | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **3a** | **Struktura wypowiedzi** | **0** | **1** | **2** | **3** |
| | | G | F E | C D | B |

| | | *Liczba błędów w spójności* | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **3b** | **Spójność wypowiedzi** | | **0** | **1** | **2** | **3** |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **3c** | **Styl wypowiedzi** | **0** | **1** |

| | | *Liczba błędów językowych* | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **4a** | **Zakres i poprawność środków językowych** | | **0** | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** |
| | | | 3H 3G 3F 2H 2G 1H | 3E 2F 1G | 3D 2E 1F | 3C 2D 1E | 3B 2C 1D | 3A 2B 1C | 2A | 1B |

| | | *Liczba błędów ortograficznych* | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **4b** | **Poprawność ortograficzna** | | **0** | **1** | **2** |

| | | *Liczba błędów interpunkcyjnych* | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **4c** | **Poprawność interpunkcyjna** | | **0** | **1** | **2** |

**Łączna liczba punktów: ……………………**

**BRUDNOPIS** ***(nie podlega ocenie)***

# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom rozszerzony

*Formuła 2023*

JĘZYK BIAŁORUSKI
Poziom rozszerzony
Formuła 2023
JĘZYK BIAŁORUSKI
Poziom rozszerzony
Formuła 2023